
Незалежны інфаматэрыял: Жодзіна, Смалявічы, Лагойск

Прэс-панарама


08.08.08



Інфарэзананс на выбарчыя падзеі



Пачатак выбарчага працэсу на выбарчых акругах №66 і №67 (Жодзіна, Смалявічы, Лагойск) ... – навіны, факты, камэнтары, высновы і заявы: грамадзтва, выбарчае права, калектыўнае супрацьстаяньне ЗА ...



*** ВЫБАР ...!?**



ПРАВА НА ВЫБАР – АСНОЎНАЕ ДЛЯ ПЕРАМЕНАЎ У ГРАМАДЗТВЕ!

Licviny-INFA



СЬВЯТЛАНА ЛАПІЦКАЯ

МЫ – БУДЗЕМ ЖЫЦЬ У СВАБОДЗЕ!

ПРАВА НА ВЫБАР – АСНОЎНАЕ ДЛЯ ПЕРАМЕНАЎ У ГРАМАДЗТВЕ!

БОЙКОТ — ОБМАНУ И ПРЕДАТЕЛЬСТВУ!

Представительница Партии БНФ Светлана Лапицкая прямо в помещении Жодинской окружной избирательной комиссии отказалась от участия в выборах в "парламент", демонстративно отказавшись регистрировать свою инициативную группу. В открытом обращении Лапицкая призвала всех высказать недоверие Центризбиркому, нынешнему режиму и не ходить на участки для голосования.


«Этот мой шаг продиктован тем, что для реальных перемен в сторону демократизации избирательного процесса, кроме политических заявлений руководства Беларуси, практически ничего не сделано. Как и ранее, сформированы надежные механизмы для манипуляции голосами избирателей, избирательными комиссиями руководят те же самые лица, которые работали на «план» во всех прошлых избирательных спектаклях…», — заявила Светлана Лапицкая

Светлана Лапицкая была выдвинута в парламент от Партии БНФ. Приводим текст открытого обращения Светланы Лапицкой.

ТЭКСТ АДКРЫТАГА ЗВАРОТУ СЬВЯТЛАНЫ ЛАПІЦКАЙ на стар. 2-3

(сайт Хартыі 97, ліпень 2008г.)

ÐÀÂÀ
ÍÀ ÂÛ ÁÀÐ



"Мы - Ліцьвіны" & Licviny-INFA

АДКРЫТЫ ЗВАРОТ СВЯТЛАНЫ ЛАПІЦКАЙ



24.07.2008 года ў памяшканьні Жодзінскай акруговай выбарчай камісыі №66 я, прадстаўніца Партыі БНФ, Сьвятлана Лапіцкая, афіцыйна абвясьціла пра сваю адмову ўдзельнічаць у так званых выбарах дэпутатаў у "палату прадстаўнікоў" "нацыянальнага сходу" Рэспублікі Беларусь чацьвёртага скліканьня, якія плянуецца правесьці восеньню 2008 года, і – дэманстратыўна адмовілася рэгістраваць сваю ініцыятыўную групу.

Гэты мой крок прадыктаваны тым, што для рэальных пераменаў у бок дэмакратызацыі выбарчага працэсу, акрамя палітычных заяваў кіраўніцтва Беларусі, практычна нічога не зроблена. Як і раней, зфармаваныя надзейныя мэханізмы для маніпуляцыяў галасамі выбарнікаў, выбарчымі камісыямі кіруюць тыя ж самыя асобы, што працавалі на "плян" ува ўсіх мінулых "выбарчых спэктаклях".

Назіраемыя разыходжаньні ў афіцыйнай рыторыцы і практычных захадах учасе прасоўваньня выбарчага працэсу, не ўключэньне ў склад акруговых выбарчых камісыяў па ўсёй краіне такіх аўтарытэтных і дасьведчаных асобаў, як Станіслаў Шушкевіч, Валянцін Голубеў, Пятро Казлоўскі, Аляксандар Сасноў, Лявон Баршчэўскі …, у тым ліку ў Жодзіне – Аляксей Лапіцкі (праваабаронца, сябра Сойму ПБНФ) – сьведчыць толькі аб адным – выбараў і на гэты раз не будзе.

Улады, ня гледзячы на афіцыйныя заявы, працягваюць (як публічна прызнаўся "гарант Канстытуцыі") "зьневажаць свой народ"... А садзейнічаць падобнаму падману сваім удзелам у чарговым выбарчым фарсе, як чалавек сумленны й адказны, я – адмаўляюся.

Заклікаю ўсіх тых, хто не разгубіў пачуцьцё ўласнае годнасьці, выказаць свой недавер кіраўніцтву ЦВК, цяперашняму рэжыму й не хадзіць на выбарчыя ўчасткі, не ўдзельнічаць у падложным спэктаклі, сканцэнтраваць свае намаганьні на адстойваньні права на рэальны, свабодны й дэмакратычны выбарчы працэс, на свабодныя й дэмакратычныя выбары ў Беларусі.

Я, Сьвятлана Лапіцкая, сябра ПБНФ, праваабаронка і грамадзкая актывістка, удзельніца ў выбарчых кампаніях 2001, 2003, 2004 і 2006 г.г. – здымаю сваю кандыдатуру не на карысьць нейкага іншага прадстаўніка ў будучым "палітычна-намэнклятурным фарсе", гэта было б абсурдным яшчэ й таму, што ўсе вылучаемыя кандыдатуры з Жодзіна і Смалявічаў сёлета – не выклікаюць даверу як сапраўды самастойныя й незалежныя палітычныя фігуры. Годная дэмакратычная альтэрнатыва не можа зьявіцца пакуль выбары не стануць рэальнымі, пакуль мы не навучым уладу паважаць кожнага з нас, нашыя правы й свабоды, свой народ.

Паставіць на месца "зарваўшагася чыноўніка" можна толькі сілаю грамадзянскага супраціву – нутранай чысьціні й несакрушальнае веры ў абавязковую перамогу праўды, права й нацыянальнай еднасьці ... Толькі шырокі грамадзкі байкот плянуемага ў нашай краіне чарговага зьдзеку з выбарчага й грамадзянскага права можа спыніць далейшае паглыбленьне краіны ў бездань падману, дыктату й здрады. Толькі так, можна прымусіць чынавенства ўзгадаць пра сапраўдную адказнасьць перад уласнымі выбарнікамі, перад кожным з нас і Беларускім народам. Падман і падмена – там, дзе вузкі "клан чыноўнікаў" узурпаваў права і праз зманапалізаваныя СМІ выказваецца ад імя ўсяго народу.

Але трэба дакладна разумець, што Беларускі народ – гэта не "група адзінадумцаў" (!?). Народ ня можа быць "партыяй" ці нейкім прыдатка да "партыі ўлады"! Як сёньня гэта спрабуе прыпадносіць афіцыйная прапаганда. У Канстытуцыі Беларусі ёсьць наўпростая забарона на падобны ідэалягічны манапалізм дзяржавы і, як сьлед, абавязковасьць падобнага "народнага адзінадумства".

Наш народ – не аморфная шэрая маса клонаў альбо марыянэтак, не "ідэалягічная прыслуга" ля "трону" ўлады. Наш народ – таленавіты, моцны й непераможны. Ён – разнастайны, талерантны й салідарны. І ня трэба "апранаць" яго ў "брудную вопратку ката", узбройваць "сякераю адзінадумства й правільнасьці", скіроўваць супраць надуманых ворагаў – "іншадумцаў"! Нашая моц – у салідарным адзінстве – адзінстве ЗА ПРАЎДУ, ГОДНАСЬЦЬ і ЗА СВАБОДУ! У тым ліку – СВАБОДУ ДУМКІ І СЛОВА! Адзінымі мы можам быць толькі ў сваім салідарным імкненьні быць свабоднымі, годнымі й заможнымі – жыць у адзінай свабоднай, мірнай і дэмакратычные Беларусі.

Усё іншае – ад Лукавага. Гэта – працяг шляху да бязконцага, злачыннага расколу грамадзтва. Але ў нас не павінна быць падзелу на "народ" і "ўсіх астатніх", на "правільных" і "апазыцыйных" грамадзянаў (апошнія – Беларусы – ужо зараз, быццам эмігранты ўва ўласнай краіне …). Таму, у нас няма

МАНІПУЛЯЦЫІ ВЫБАРЧЫМІ ДАКУМЭНТАМІ – ЎЖО НА ЭТАПЕ ФАРМАВАНЬНЯ АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСЫЯЎ

ПЕРШЫЯ ДАКУМЭНТАЛЬНЫЯ ДОКАЗЫ – У ЖОДЗІНЕ!

Відавочны прыклад – адмова разглядаць кандыдатуру сябра сойму Партыі БНФ, Аляксея Лапіцкага з Жодзіна на паседжаньні Менскага аблвыканкаму 14.07.2008г. з-за быццам «несваечасовай падачы» ім адпаведнай заявы з 108 подпісамі грамадзянаў, вылучыўшых праваабаронцу ў склад Жодзінскай

АДКРЫТЫ ЗВАРОТ ...

большага ворага ў краіне, чым падобная "усеагульнанародная афіцыйная правільнасьць" – яна ёсьць пачаткам і працягам неправамернае практыкі "перасьледу за іншадумства" ...

Адзінымі мы можам быць толькі ў свабоднай, незалежнай і дэмакратычнай Беларусі, якая памятае, адэкватна ўспрымае і разумее, як урокі гіторыі, гэтак і сучаснасьць, ідзе ў ногу з часам, прырастае сябрамі, а не стварае новых і новых ворагаў ...

Таму, я заклікаю да супраціву цяперашняму цынізму й нахабству, зь якімі ўлады рыхтуюцца ў чарговы раз падмануць і яшчэ больш разьяднаць беларускае грамадзтва. Я заклікаю да супраціву падлогу й здрадзе, зь якімі ў Беларусь насоўваецца кланава-алігархічны падзел маёмасьці на новай стадыі – "правільнай беларускай прыхватызацыі" ...

Як без права свабоднага выбару можна заставацца гаспадаром на сваёй уласнай зямлі, быць сапраўдным грамадзянінам ва ўласнай дзяржаве?

Байкот не выбараў, але выбарчага фарсу патрэбен, як рашучы аргумэнт супраціву – для дасягненьня зьменаў у афіцыйных трактоўках палажэньняў Выбарчага Кодэксу РБ, для прыняцьця дакладна прапісанай дэмакратычнай працыдуры па фармаваньні збалансаваных па складзе, самастойных выбарчых камісыяў, для правядзеньня ўсіх этапаў выбарчага працэсу пад пільным праўным кантролем грамадзтва. Беларусі, як паветра, сёньня патрэбныя рэальная свабода СМІ, свабода слова і думкі, мірных мітынгаў і сходаў, асацыяцыяў …, свабода выбару, безь якіх немагчымая ратацыя на любых узроўнях улады, грамадзянская актыўнасьць і зваротная сувязь з выбарнікамі, сапраўдны НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ за чынавенствам, рост праўнай культуры й адказнасьці, ўпэўненасьці ў дзейснае сіле права …

Ï ðààñòàўí³ê Æî äç³í ñêàãà ðýã³¸íó ў "ï àðòèýì ýí öå" (ÿê ³ ³í ø û õ ðýã³¸í àў Áåëàðóñ³) ï àâ³í åí áû öü ï ðû í öû ï î âû ì ³ ñüì åëû ì ÷àëàâåêàì , àêòûўí û ì àáàðî í öàì í àø û õ ãðàì àäçÿí ñê³õ ï ðààâî ў ³ ñâàáî äàў, à í å êàí òðàëþ åì àé ï åø êàþ ў ðóêàõ ³äýàëÿã³÷í û õ àäçüäçåëàў ³ í àì ýí êëÿòóðí àé àўòàêðàòû ³. Ëþ áî ãà ðàí ãó ÷û í î ўí ³ê âà ўëàäçå – àáàâÿçàí û æû öü ï à äçåéñí û õ ó êðà³í å çàêî í àõ. Ñï ýöñëóæáû – ï àâ³í í û ñëóæû öü äçÿðæàâå é í àðî äó, áû öü ï àäñï ðàâàçäà÷í û ì ³ é êàí òðàëÿâàööà ãðàì àäçòâàì , ÿêî å ì óñ³öü ï àçáàâ³ööà ñòðàõó ï àë³òû ÷í àãà ï åðàñüëåäó é äû êòàòó.

ß öàëêàì ï àäçÿëÿþ äóì êó òû õ ï àë³òû êàў ³ ï ðààâààáàðî í öàў, ó òû ì ë³êó ñâàéãî ì óæà, адзінадумцы й сябра, Аляксея Лапіцкага, які ўпэўнены ў тым, што кожны, хто сваім удзелам падтрымае будучы "выбарчы фарс" у Беларусі, так ці іначай, будзе вымушаны гуляць па правілах дзейснага рэжыму ... А апошні сёньня, проста, спрабуе купіць міравую супольнасьць за некалькі верагодных "незалежнікаў" у "парлямэнце", якіх "толькі ён" можа "працягнуць" туды і "толькі за вушы"...

"Але выйграць СВАБОДУ, выйграць ПАВАГУ ДА СЯБЕ, давер у сваіх дзяцей, выйграць БУДУЧУЮ, САПРАЎДЫ СВАБОДНУЮ І МОЦНУЮ СВАІМ АДЗІНСТВАМ БЕЛАРУСЬ – нельга, гуляючы па правілах ЦЫНІЗМУ, ХЛУСЬНІ І ЗДРАДЫ …

Нам патрэбны – спраўдныя выбары!
БАЙКОТ – ПАДМАНУ І ЗДРАДЗЕ!

МЫ – БЕЛАРУСЫ! І МЫ – ЛІЦЬВІНЫ!

МЫ – СПАТКАЕМЦЫ НАШАЙ ВЯЛІКАЙ І ВОЛЬНАЙ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ!

БУДЗЬМА РАЗАМ І – ПЕРАМОЖАМ!
ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!"



Аляксей Лапіцкі

акруговай №66 выбарчай камісыі.

Дадзеную афіцыйную матывацыю неўключэньня прэтындэнта ў склад акруговай камісыі ў Жодзіне прадставіў яму начальнік Галоўнага ўпраўленьня арганізацыйна-кадравай працы менаблвыканкаму Міхаіл Амельянчук у сваім пісьмовым адказе ад 06.08.2008г. за №302-740 на адпаведны пратэст праваабаронцы ад 16.07.2008г.

Але ў заяўніка маецца зусім адваротнае дакумэнтальнае сьведчаньне – дакумэнт аб своечасовай перадачы ў Менаблвыканкам неабходнага замоўнага паштовага адпраўленьня!

Такім чынам, Аляксей Лапіцкі адзначае наяўнасьць у дадзеным факце прыкметаў службовага падлогу й маніпуляцыяў выбарчымі дакумэнтамі, падтасоўкі фактаў з мэтаю дыскрымінацыі апанэнта ўлады па палітычных матывах учасе фармаваньня асноўных мэханізмаў па арганізацыі й кантролю за распачатым у Беларусі выбарчым працэсам – Акруговых выбарчых камісыяў.

Па факце неправамерных дзеяньняў пададзены адпаведныя заявы ў ЦВК і Пракуратуру Менскай вобласьці.

08.08.2008г.,
Алесь Вольны,
Licviny-INFA



11 июля 2008 года включительно. Ваше заявление было получено по почте 12.07.2008 года Минским областным Советом депутатов.

В связи с тем, что срок приема документов по выдвижению кандидатов в состав окружных избирательных комиссий на момент получения Вашего заявления истек, вопрос о включении Вас в состав окружной избирательной комиссии по Жодинскому избирательному округу №66 не рассматривался.

Начальник главного управления
организационно-кадровой работы
Минского облисполкома М.М.Омельянчук



Фотакопіі дакумэнтаў:
1) адказ Амельянчука М.М.;
2) Квітанцыя па своечасовай дастаўцы паштовага адпраўленьня.

Парламенцкія выбары. Падзеі і абагульненьні

Праваабаронцы пад шчыльным кантролем падатковых органаў. Кампанія дзяржаўных СМІ па дыскрэдытацыі

Пасьля абвяшчэння праваабаронцамі намеру праводзіць маніторынг парламенцкіх выбараў, пачалася іх актыўная дыскрэдытацыя з боку дзяржаўных СМІ (сюжэт на "Першым канале" Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі). Адначасова пачалася дэталёвая праверка падатковай гісторыі праваабаронцаў. Толькі за два тыдні загады Міністэрства па падатках і зборах аб неабходнасьці падаць дэкларацыі аб прыбытках і маёмасьці атрымалі старшыня БХК Алег Гулак, першы старшыня арганізацыі Тацяна Працька, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека Алесь Бяляцкі, супрацоўнік БХК Зьміцер Маркушэўскі, праваабаронца Валянцін Стэфановіч і чальцы іх сем'яў.

Звальненьне за намер балатавацца ў дэпутаты

Кіраўнік кобрынскай суполкі Партыі БНФ, актывіст Руху "За Свабоду" Аляксандр Мех, які зьбіраецца балатавацца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па Кобрынскай выбарчай акрузе, быў звольнены з пасады інжынера Упраўлення магістральных газаправодаў ТАА "Белтрансгаз".
4 чэрвеня Алеся выклікалі ў кабінет дырэктара прадпрыемства. Там адбылася гутарка з начальнікам прадпрыемства Уладзімірам Галашка і кіраўніком мясцовага КДБ Андрэем Басько. Актывіста наўпрост папярэдзілі: "Калі пойдзеш на выбары, будзеш звольнены".
Алесь Мех сумленна працуе на прадпрыемстве 14 год. Ягоныя калегі і непасрэдны начальнік звярталіся да кіраўніцтва як мясцовага, так і галаўнога прадпрыемства, з просьбай перагледзець рашэнне аб звальненні Меха. Тым не менш, 30 чэрвеня яго азнаёмілі з загадам аб звальненні (з ім папросту не працягнулі кантракт) і выдалі на рукі працоўную кніжку.

Рэпрэсіі супраць удзельнікаў маніторынгу выбараў

26 чэрвеня супрацоўнікамі міліцыі і КДБ каля офісу БХК, дзе мела адбыцца нарада па маніторынгу за выбарамі, быў затрыманы сябар Беларускага Хэльсінскага камітэта, адзін з удзельнікаў маніторынгу за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Эдуард Баланчук. На Эдуарда Баланчука былі складзены 2 пратаколы: непадпарадкаваньне законнаму распараджэнью ці патрабаваньню службовай асобы пры выкананьні ім службовых паўнамоцтваў (арт 23.4 КаАП) і дробнае хуліганства (арт 17.1 КаАП). Справа разглядалася у судзе Маскоўскага раёну Менска суддзём Харкевічам. Суд, прыняўшы да ўвагі паказаньні сьведкаў з боку прадстаўнікоў праваахоўных органаў і праігнараваўшы паказаньні сьведкаў з боку абвінавачваемага прызнаў Эдуарда Баланчука вінаватым і пакараў 10 суткамі арышту і грашовым штрафам у памеры 1 мільён 50 тысяч рублёў.

Олег Гулак: «Формирование окружных комиссий проходило в закрытом режиме»

Правозащитники отмечают непрозрачность формирования окружных избирательных комиссий.

Формирование окружных избирательных комиссий завершилось 14 июля. По данным секретаря Центризбиркома Николая Лозовика, в их состав включено 38 представителей оппозиционных партий: 17 активистов Объединенной гражданской партии, 5 — Партии БНФ, 10 — Партии коммунистов Белорусской, 6 — Белорусской социал-демократической партии (Грамада).

Как отметил в интервью БелаПАН председатель общественного объединения "Белорусский Хельсинкский комитет" (БХК) Олег Гулак, то, что 38 активистов демсил вошли в окружные избирательные комиссии, — "хороший показатель". На прошлых "парламентских выборах", напомнил он, членами окружных комиссий стали всего 22 активиста оппозиции. Таким образом, "увеличение наблюдается почти на треть", отметил О.Гулак. Вместе с тем, по его словам, правозащитников "беспокоит то, что формирование комиссий проходило в фактически закрытом режиме".
Кроме того, по сведениям БХК, практически на все заседания по формированию комиссий не смогли попасть наблюдатели и журналисты. "Решения о формировании комиссий принимались буквально за полчаса. Нам неизвестно, какая там была процедура, как принимались решения. Формально, конечно, на этих заседаниях присутствие наблюдателей не обязательно, однако в таком случае невозможно говорить о прозрачности фактически первого этапа избирательной кампании", — считает О.Гулак.

В свою очередь, вице-президент Международной федерации прав ÷åëîâåêà **Алесь Беляцкий отмечает:** "Комиссии сформированы по тому же принципу, по которому они формировались во время предыдущих "избирательных кампаний" — и президентской, и парламентской. Конечно, то, что представителей политических партий в них сейчас больше, обнадеживает — но только в том плане, что мы будем знать, как работают 38 из 110 окружных избирательных комиссий. Больше мы ничего не добьемся".
А.Беляцкий также считает, что наличие одного представителя демократических сил в комиссии, состоящей из 13 человек, "ничего не решает". "В идеале комиссия должна состоять из представителей заинтересованных политических партий и организаций", — полагает правозащитник.

Праваабаронца з Жодзіна, Аляксей Лапіцкі, дадае, што ягоная кандыдатура пры фармаваньні Жодзінскай акруговай камісыі №66 у парушэньне законнай працыдуры ў Менскім аблвыканкаме – зусім не разглядалася. Ігнаруючы волю грамадзянаў, парушаючы выбарчыя правы жодзінцаў і ВК РБ, улады пайшлі на просты (верагодна звычайны для іх) падлог дакумэнтаў выбарчага зьместу й маніпуляцыю фактамі толькі для таго, каб нейк апраўдацца. Так, начальнік Галоўнага арганізацыйна-кадравага адзьдзелу выканкаму Міхал Амельянчук у сваім афіцыйным адказе на пратэст патлумачыў, што кандыдатура не разглядалася таму, што неабходныя дакумэнты для вылучэньня ў склад АВК №66 дастаўлены поштаю ўжо пасьля належнага тэрміну рэгістрацыі, 12.08.08.

Аднак, у праваабаронцы маецца на руках дакумэнт, які сьведчыць зусім пра іншае: адпраўлены 07.08.08 ліст з подпісамі грамадзянаў быў перададзены па прызначэньні не 12.08.08, а ўжо праз 2 дні пасьля адпраўкі, 09.08.08.

Па факце дадзенай маніпуляцыі фактамі й дакумэнтамі выбарчага зьместу, праваабаронца Аляксей Лапіцкі ўжо скіраваў адпаведныя заявы ў ЦВК і Пракуратуру Менскай вобласьці.

Як лічыць Аляксей Лапіцкі, дадзены факт красамоўна паказвае, як проста "загартаваная гадамі безадказнасьць" чыноўнікаў прыводзіць да кардынальных зьменаў у спосабах мысьцленьня – з нармальных на крымінальныя. Падмена законных выбарчых працэдураў цалкам відавочнымі неправамернымі дзеяньнямі, а выбарчага права грамадзянаў – карпаратыўна-кланавай мэтазгоднасьцю чыноўнікаў – становіцца ўжо цяжка схаванай звычкаю й спосабам захаваньня ва ўладзе... Не зробіш – станеш белай воранаю, пойдзеш супраць сыстэмы.

Гэта толькі чарговы раз дэманструе, з кім даводзіцца мець справы прадстаўнікам апазыцыі, адкрывае вочы аматарм "тэлевізійных казак" на выбарчыя рэаліі так званага самага дэмакратычнага, празрыстага й адкрытага ў сьвеце, выбарчага працэсу ў Беларусі ... (Выкарыстаны правапіс арыгіналаў)

Незалежны выпуск інфапраспэкту - улёткі, Жодзінскі рэгіён
(Выдавецкая ініцыятыва "ЗА СВАБОДНЫ ВЫБАР", Licviny-INFA)
Без рэдакцыі ...
Ініцыятыва СВАБОДЫ
Наклад 499 асобнікаў.
АЛЕСЬ ВОЛЬНЫ ...
ÏÏ ÐÀÂÀ ÍÀÂÛ ÁÀÐ
R AL
Пры передруку спасылка на інфа-матэрыял абавязковая ...